## Першы крок

Ёсьць справы, аб каторых ня можа быць ніякай споркі: яны гэтак ясны, як Божы дзень.

Да такіх спраў належыць і справа навучаньня дзяцей асноў веры і малітв у іх роднай, матчынай мове. І тыя, хто працівіцца, каб дзетак беларускіх вучылі б па–беларуску, ня мелі ніколі сьмеласьці сказаць, што гэта *не патрэбна:* яны працівяцца законнаму жаданьню нашага народу толькі дзеля сваей „палітыкі“.

Усё, што робіцца дзеля „палітыкі“, павінна зьмяняцца, калі зьмяняецца сама гэта „палітыка“. Вось у міністэрстве прасьветы, як настаў новы міністар — гр.[1] Ігнацьеў, бачым новы паварот: міністэрства прызнала, што ніякая „палітыка“ не павінна адымаць у дзяцей матчынай мовы, бо безь яе і навука ня йдзе ў галаву. Нядзіва: то ж дзіцяці зусім не пад сілу зразу набірацца і новых ведамасьцей, і новых — *чужых* — слоў. У навучаньні не павінна быць мейсца для „палітыкі“: тутака поўнае панаваньне *пэдагогікі.*

На зьездзе папячыцеляў навуковых акругоў[2] у Петраградзе паднялася была гутарка аб беларусах. Першы раз галава міністэрства, гр. Ігнацьеў, закрануў беларускую справу. Ён зазначыў, што нашы настаўнікі і вучыцелі гэтак ужо прывучаны беларускай гутаркі ня лічыць за мову, а за „расейскі правінцыялізм“, што і павясьці навуку каталіцкай веры для беларусаў па–беларуску зь імі будзе трудна. Але ўсё ж такі *беларусы маюць права вучыцца рэлігіі па–свойму,* і ўсялякая забарона можа толькі зрабіць зь іх ворагаў Расеі.

Гэтак, як мы даведаліся ў Віленскім вучэбным окрузе, казаў міністар. І ўсе папячыцелі згадзіліся зь ім.

Як будзе далей? Ці пастанова зьезду будзе споўнена і — як?

Мы ведаем нашых вучыцялёў. Мы ведаем, што іх з малых дзён прывучалі да пагарды да іх роднай беларускай мовы, прывучалі чурацца яе, бо яна „псавала“ расейскую мову... У такім духу ўзрасталі яны, праходзілі навукі ў сэмінарыях і інстытутах для вучыцялёў і, прыяжджаючы ў сваю вёску, ужо гаварылі толькі па–расейску. Лёгка зразумець, як гэта адбівалася на нашых сялянах, каторыя памалу гублялі сваю чалавечу гордасьць, пачалі думаць, што самі яны, іх мова, іх песьня–казка — усё гэта нікчэмнае, безь ніякай вартасьці і цаны, што толькі тады зробяцца яны „людзьмі“, калі пойдуць сьледам сваіх настаўнікаў...

Цяпер народ ужо глядзіць на сьвет Божы і на сябе цьвярозымі вачыма. Ён ужо пазнаў, што кожын мае права *быць чалавекам,* што ўсе народы створаны не затым, каб іх нехта перарабляў на „чужы капыл“, а затым, каб тварыць сваю асобную культуру, каб разьвіваць усё тое — сваё, асобнае, што заложана ў яго душу і не заложана ў душу другіх народаў.

Першае жаданьне сьведамых беларусаў — гэта здабыць належнае месца для сваей мовы ў школе, у царкве і касьцёле. Доўга гэтаму працівіліся школы і духавенства. Але вось цяпер беларусам пачынаюць рабіць уступкі: дзе–нідзе ў касьцёлах чутно слова божае па–беларуску, а вось сьледам ідзе і міністэрства асьветы: яно зрабіла першы крок, каб дапусьціць нашу родну мову ў школу.

Мы ведаем (як гэта сказаў і сам міністар), што нашы „настаўнікі“ будуць сьпярша крыва глядзець на „навіну“. Але мы ведаем, што раней ці пазьней у іх прыспаных сэрцах абудзіцца гарачая любоў да сваей забытай маткі–Беларусі, каторая ўжо ступіла на дарогу да новага жыцьця, да новай сьветлай будучыны!

## Іх адказ

Яны не зьмяніліся.

„Нашы“ *паны* — палякі, апрача невялікай грамадкі людзей зь сьвятлейшымі галавамі і шчырымі сэрцамі, і сягоньня астаюцца такімі, якімі былі паўвека назад[1].